УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”

# ГУРЫЧ СОФ’Я ЯКАЎЛЕЎНА

**АКТРЫСА, РЭЖЫСЁР**

**29 СНЕЖНЯ 1919 г. – 28 КРАСАВІКА 1999 г.**

**ФОНД № 358**

**ВОПІС № 1**

**1938 – [1983-я гг.]**

МІНСК 2017

# ЗМЕСТ

**да воп. № 1 ф. 358**


| №№ | Назва раздзелаў | № справў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1. | ТВОРЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ С.Я. ГУРЫЧ | 1 - 59 | 1 - 6 |
| 1.1. | ФАТАГРАФІІ С.Я. ГУРЫЧ У РОЛЯХ І СЦЭНАХ СА СПЕКТАКЛЯЎ, СЫГРАНЫХ У ТЮГ БССР ІМЯ Н.К. КРУПСКАЙ І БРЭСЦКІМ АБЛАСНЫМ ДРАМТЭАТРЫ ІМЯ ЛЕНІНСКАГА КАМСАМОЛА | 1 - 4 | 1 |
| 1.2. | П'ЕСЫ, РАДЫЁП'ЕСЫ, ТЭЛЕП'ЕСЫ, СЦЭНАРЫІ | 5 - 37 | 1 - 4 |
| 1.3. | ІНСЦЭНІРОЎКІ | 38 - 49 | 4 - 5 |
| 1.4. | АПАВЯДАННІ, АРТЫКУЛЫ І ІНШ. | 50 - 59 | 5 - 6 |
| 2. | ПІСЬМЫ ДА С.Я. ГУРЫЧ | 58-59 | 6 |
| 3. | ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ С.Я. ГУРЫЧ | 60 - 76 | 6 - 8 |
| 4. | ДАКУМЕНТЫ ПРА С.Я. ГУРЫЧ | 77 - 92 | 8 - 10 |
| 5. | ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ | 93 - 98 | 10 - 11 |

## Прадмова

Гурыч Соф'я Якаўлеўна нарадзілася 29 снежня 1919 г. у г. Сумы УССР. Закончыла беларускую студыю пры Цэнтральным тэатральным вучылішчы ў Ленінградзе, працавала актрысай у Тэатры юнага гледача БССР імя Н.К. Крупскай (1937-1941). Выканала ролі: Фелікса ("Наша зброя" А. Крона), Гешкі ("Чарамыш, брат героя" паводле Л. Касіля), Валі Брузжак ("Як гартавалася сталь" паводле М.А. Астроўскага), Ніны ("Ноч у верасні" І. Чэкіна), Зербінеты ("Хітрыкі Скапэна" Ж.-Б. Мальера), Шурыка ("Казка" М.А. Святлова) і інш. У час Вялікай Айчыннай вайны была начальнікам клуба эвакашпіталя, а з 1942 г. да 1944 г. – дырэктарам радыёстанцыі "Савецкая Беларусь" (Масква). Актрыса і рэжысёр у Брэсцкім абласным драмтэатры імя Ленінскага камсамола (1944-1950). У 1951 г. вучылася на рэжысёрскіх курсах у ГИТИСе (г. Масква). З лістапада 1951 г. да верасня 1954 г. працавала рэжысёрам Славянскага дзяржаўнага рускага драмтэатра імя У.У. Маякоўскага (УССР). Ёй былі пастаўлены наступныя спектаклі: "Таня" А.М. Арбузава, "Завтра будет нашим" К. Мюфке, "Стрекоза" М. Бараташвілі, "Юность отцов" Б.Л. Лаўранёва, "Опасный спутник" А. Салынскага і інш. У 1955 г. пераведзена ў Гомельскі абласны драмтэатр (1955-1957). Сярод яе пастановак: "Гісторыя аднаго кахання" К.М. Сіманава, "Іван Рыбакоў" В.М. Гусева, "Маці сваіх дзяцей" А.М. Афінагенава, "Хітрамудрая закаханая" Лопэ дэ Вэгі і інш. З 1957 г. працавала рэжысёрам, з 1959 г.– галоўным рэжысёрам Белдзяржфілармоніі. З 1966 г. – рэжысёр, у 1967 – 1986 гг. – галоўны рэжысёр, з 1986 г. – рэжысёр вышэйшай катэгорыі літаратурна – драматычнага вяшчання Беларускага рэспубліканскага радыё. Ажыццявіла больш за 200 радыёпастановак, пераважна твораў беларускай прозы і паэзіі (у большасці была і аўтарам інсцэніровак). Сярод іх: "Жураўліны крык", "Пайсці і не вярнуцца" В.У. Быкава, "Хлеб", "Першы генерал", "Вазьму твой боль" І.П. Шамякіна, "Рудабельская рэспубліка", "Васіль Корж" С.І. Грахоўскага, "Песня Дзвіны" Т.К. Хадкевіча, "Мінскі напрамак, "Завеі, снежань" І.П. Мележа, "Векапомныя дні" М.Ц. Лынькова, "Новая зямля", "Рыбакова хата" Я. Коласа, "Хамуціус" А.А. Куляшова і інш. Стварыла на радыё цыкл творчых партрэтаў майстроў тэатраў Беларусі: Г.Б. Абуховіч, З.І. Браварскай, А.І. Клімавай, Г.К. Макаравай, Ю.У. Сідарава і інш. З 1989 г. С.Я. Гурыч займалася свабоднай творчай дзейнасцю.

Лаўрэат Дзяржаўных прэмій у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры: у 1974 г. за радыёспектакль"Векапомныя дні" паводле рамана М.Ц. Лынькова і ў 1984 г. за радыёспектаклі "Хамуціус" паводле паэмы А.А.

Куляшова і “Рыбакова хата” паводле паэмы Я. Коласа. Заслужаны работнік культуры Беларусі (1985).

Памерла С.Я. Гурыч 28 красавіка 1999 г. Пахавана ў Мінску.

Дакументы С.Я. Гурыч паступілі ў БДАМЛМ у 1991 г. ад самой фондаўтваральніцы. У 2017 г. яны прайшлі навукова - тэхнічную апрацоўку, у выніку чаго быў складзены воп. №1 у колькасці 98 спраў (289 дак.) за 1938 – [1980-я гг].

Вопіс складаецца з 5 раздзелаў.

1. У раздзеле “Творчыя дакументы С.Я. Гурыч” 4 падраздзелы, справы ў якіх сістэматызаваны па жанрах і храналогіі за 1938 – [1980-я гг]. У падраздзеле 1.1. сабраны фатаграфіі сцэн з спектакляў, сыграных С.Я. Гурыч у ТЮГ БССР імя Н.К. Крупскай за 1938 – 1940 гг.: Макса (“Гады выпрабавання” К. Раймонд), Ніны (“Ноч у верасні” І. Чэкіна), Шурыка (“Казка” М.А. Святлова) і ў ролі Антона (“Старыя сябры” Л.А. Малюгіна), сыгранай у Брэсцкім абласным драмтэатры імя Ленінскага камсамола БССР. У падраздзел 1.2. па храналогіі ўвайшлі п’есы С.Я. Гурыч: “Доктара мне”, “Вера, Надежда, Любовь”, “Танежскія дзяўчаты”, “Миколкино путешествие”, радыёп’есы “Возвращение”, ”Улица Петра Блохина 17”, “Под одной крышей”, “Жураўліны крык” (паводле аповесці В.У. Быкава), “Хлеб” (паводле апавядання І.П. Шамякіна), “Песня Дзвіны” (паводле рамана Т.К. Хадкевіча), “Хатынскі снег” (паводле паэмы Г.М. Бураўкіна), “Пушча” (паводле рамана В.Ф. Карамазава), сцэнарыі радыёперадач, тэлеп’есы за 1959 – [1980- я гг]. Інсцэніроўкі С.Я. Гурыч раманаў І.П. Шамякіна ”Глубокое течение”, І.П. Мележа “Мінскі напрамак”, аповесці В.У. Быкава “Пайсці і не вярнуцца”, апавядання А.П. Кудраўца “Вяселле” і інш. сабраны ў падраздзеле 1.3. за 1956 – [1980-я гг]. Апавяданні, артыкулы, нататкі, выступленне С.Я. Гурыч склалі падраздзел 1.4. за 1959-[1980-я гг].

2. Раздзел сабраў пісьмы да С.Я. Гурыч ад Б.Е. Жукоўскага, І.П. Шамякіна, Палаца культуры МТЗ, рэдакцыі газеты “Советская культура” і інш. за 1947-1979 гг.

3. Біяграфічныя дакументы С.Я. Гурыч сістэматызаваны па храналагічна - тэматычным прынцыпе і прадстаўлены яе камандзіровачнымі пасведчаннямі, рэпертуарным лістком Брэсцкага абласнога драмтэатра імя Ленінскага камсамола БССР, дакументамі на вылучэнне Дзяржаўных прэмій БССР у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры за 1974 і 1984 гг., афішы і

праграмы спектакляў Брэсцкага абласнога драмтэатра імя Ленінскага камсамола БССР, Славянскага дзяржаўнага рускага драмтэатра імя У.У. Маякоўскага, Гомельскага абласнога рускага драмтэатра і інш. за 1947 – 1985 гг.

4. У раздзел увайшлі дакументы пра С.Я. Гурыч. Справы сфарміраваны па жанрах і храналогіі за 1952 – [1980-я гг].

5. Раздзел “Выяўленчыя дакументы” склалі фатаграфіі С.Я. Гурыч, індывідуальныя, з сябрамі, Г.А. Арловай, М.Г. Захарэвіч, З.П. Зубковай, Ю.У. Сідаравым і інш. за [1948-1980-я гг].

Прадмову склала І.А. Евенка

вяд. архівіст

18.07.2017

ПРАТАКОЛ ЭМК №__________

ад "_____"____________20____ г.

ЗАЦВЯРДЖАЮ:

Дырэктар БДАМЛіМ

_____________ Г.В.Запартыка

"_____"____________20____ г.

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1. ТВОРЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ С.Я. ГУРЫЧ** | | | | |
| | **1.1. ФАТАГРАФІІ С.Я. ГУРЫЧ У РОЛЯХ І СЦЭНАХ СА СПЕКТАКЛЯЎ, СЫГРАНЫХ У ТЮГ БССР ІМЯ Н.К. КРУПСКАЙ І БРЭСЦКІМ АБЛАСНЫМ ДРАМТЭАТРЫ ІМЯ ЛЕНІНСКАГА КАМСАМОЛА** | | | | |
| 1 | Фатаграфіі сцэны з спектакля ТЮГ БССР "Гады выпрабавання" К. Раймонд (рэж. Е.А. Міровіч) з удзелам С.Я. Гурыч (у ролі Макса), П.С. Басінкевіча (у ролі Вілі) і інш.<br>Копіі | 1938 | 2 | 2 | |
| 2 | Фатаграфія сцэны з спектакля ТЮГ БССР імя Н.К. Крупскай "Ноч у верасні" І. Чэкіна (рэж. Е.А. Міровіч) з удзелам С.Я. Гурыч (у ролі Ніны), Л.М. Фрыдмана (у ролі Слівы) і інш.<br>Копія | 1938 | 1 | 1 | |
| 3 | Фатаграфіі сцэн з спектакля ТЮГ БССР імя Н.К. Крупскай "Казка" М.А. Святлова (рэж. М. Сухараў) з удзелам С.Я. Гурыч у ролі Шурыка і інш.<br>Копіі | 1940 | 2 | 2 | |
| 4 | Фатаграфія С.Я. Гурыч у ролі Антона "Старыя сябры" Л.А. Малюгіна (рэж. У. Яфімаў), сыгранай у Брэсцкім абласным драмтэатры імя Ленінскага камсамола.<br>Копія | 1947 | 1 | 1 | |
| | **1.2. П'ЕСЫ, РАДЫЁП'ЕСЫ, ТЭЛЕП'ЕСЫ, СЦЭНАРЫІ** | | | | |
| 5 | "Доктара мне". П'еса. Варыянты.<br>Машынапіс.<br>Прыкладзена выпіска з пратакола ад 24.12.1959 г. з абмеркаваннем п'есы і рэкамендацыяй для пастаноўкі. Л. - 27 | 1959 | 27 | 2 | |
| 6 | "Вера, Надежда, Любовь". П'еса.<br>Машынапіс з аўтарскай праўкай | 1960 | 11 | 1 | |
| 7 | "Танежыцкія дзяўчаты"="На лясной палянцы". Варыянты. П'еса.<br>Машынапіс з аўтарскай праўкай, машынапіс | 1962 | 118 | 2 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 8 | "Танежицкие девчата". П'еса. Варыянт.<br>Машынапіс | 1963 | 73 | 1 | |
| 9 | "Миколкино путешествие". П'еса. Варыянты.<br>Аўтограф, машынапіс | [1960-я гг] | 84 | 2 | |
| | * * * | | | | |
| 10 | "Возвращение". Радыёп'еса. Варыянты.<br>Аўтарызаваны машынапіс, машынапіс з аўтарскай праўкай | 1964 | 55 | 3 | |
| 11 | "Улица Петра Блохина 17..." Радыёп'еса.<br>Варыянты.<br>Машынапіс | [1960-я гг] | 67 | 3 | |
| 12 | С.Я. Гурыч, А. Карнееў. "Под одной крышей".<br>Радыёп'еса.<br>Машынапіс | [1960-я гг] | 14 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 13 | "Жураўліны крык". Радыёп'еса паводле аднайменнай аповесці В.У. Быкава.<br>Аўтограф | 1966 | 69 | 1 | |
| 14 | "Запіска". Радыёп'еса паводле аднайменнага апавядання Э.А. Шуміліна.<br>Машынапіс | [1960-я гг] | 14 | 1 | |
| 15 | "Самый высокий этаж". Радыёп'еса паводле аповесці А.А. Савіцкага.<br>Машынапіс з аўтарскай праўкай | 1970 | 42 | 1 | |
| 16 | "Хлеб". Радыёп'еса па аднайменным апавяданні І.П. Шамякіна.<br>Аўтограф | 1971 | 26 | 1 | |
| 17 | "Песня Дзвіны". Радыёп'еса па матывах рамана Т.К. Хадкевіча.<br>Аўтарызаваны машынапіс | 1973 | 33 | 1 | |
| 18 | "Ніколі не забудзем..." Радыёп'еса паводле твораў П.У. Броўкі, І.П. Мележа, І.П. Шамякіна і інш.<br>Машынапіс з аўтарскай праўкай | 1975 | 28 | 1 | |
| 19 | "Смертный враг". Радыёп'еса паводле аповесці М.А. Шолахава.<br>Машынапіс | [1970-я гг] | 14 | 1 | |
| 20 | "Дарогай сумнення". Радыёп'еса паводле аднайменнага апавядання [Ю.] Нікіціна. | [1970-я гг] | 14 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Машынапіс | | | | |
| 21 | "Грибная осень или Повесть о любви инспектора лесов и вод Фёдора Колтухо". Радыёп'еса па матывах аповесці І.І. Шклярэўскага. Варыянты. Машынапіс | [1970-я гг] | 73 | 2 | |
| 22 | "Хатынскі  снег". Радыёп'еса паводле паэмы Г.М. Бураўкіна. Машынапіс | [1970-я гг] | 8 | 1 | |
| 23 | "Возьму твою боль". Радыёп'еса  па аднайменнаму раману І.П. Шамякіна . Першая і другая часткі. Машынапіс | 1980 | 59 | 1 | |
| 24 | "Пушча". Радыёп'еса паводле рамана В.Ф. Карамазава. Варыянт. Аўтограф | [1980-я гг] | 123 | 1 | |
| 25 | "Пушча". Радыёп'еса паводле рамана В.Ф. Карамазава. Варыянт. Машынапіс | [1980-я гг] | 51 | 1 | |
| 26 | "Браняпоезд "Таварыш Ленін". Радыёп'еса па матывах аповесці І.П. Шамякіна. Машынапіс з аўтарскай праўкай | [1980-я гг] | 21 | 1 | |
| 27 | "Галуба". Радыёп'еса па матывах аповесці В.Ф. Карамазава. Машынапіс з аўтарскай праўкай | [1980-я гг] | 14 | 1 | |
| 28 | "В каменных джунглях". Радыёп'еса па матывах апавядання Г. Слезара "Крик в ночи". Аўтарызаваны машынапіс | [1980-я гг] | 10 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 29 | "Сустрэчы". Сцэнарый радыёперадачы з удзелам А.І. Клімавай, І.П. Шамякіна , Ф.М. Шмакава і інш. Аўтограф | 1977 | 34 | 1 | |
| 30 | "Гастрольнае лета ў Мінску", "Міжнародны дзень тэатра", "Навіны тэатральнага жыцця"  і інш. Сцэнарыі радыёперадач пра навіны беларускіх тэатраў. Машынапіс з аўтарскай праўкай , машынапіс | 1977-1982 | 46 | 6 | |
| 31 | "На вясёлай сатырычнай хвалі". Сцэнкі для радыёперадач. Машынапіс | [1970-я гг] | 33 | 2 | |
| 32 | "Голас Савецкай Беларусі". Сцэнарый | [1980-я гг] | 8 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | радыёперадачы пра радыёстанцыю "Савецкая Беларусь". Машынапіс | | | | |
| | * * * | | | | |
| 33 | "Ну і моладзь!" Драматычная сцэнка. Выразка з часопіса | 1970 | 2 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 34 | "Самый высокий этаж". Тэлеп'еса паводле аднайменнай аповесці А.А. Савіцкага. Машынапіс | 1973 | 40 | 1 | |
| 35 | "Заброшенный хутор". Тэлеп'еса па аднайменнаму апавяданню С.Л. Курылёвай. Варыянты. Машынапіс з аўтарскай праўкай | [1975] | 27 | 1 | |
| 36 | "Андрей Летун и его друзья". Тэлеп'еса паводле апавяданняў М.Ц. Лынькова. Машынапіс | [1970-я гг] | 62 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 37 | "Піліп Пестрак". Сцэнарый тэлеперадачы (аўтар С.Я. Гурыч, рэж. Ю. Сурыкаў). Машынапіс | [кан.1960-х гг] | 8 | 1 | |
| | **1.3. ІНСЦЭНІРОЎКІ** | | | | |
| 38 | "Глубокое течение". Інсцэніроўка рамана І.П. Шамякіна. Варыянт. Машынапіс з аўтарскай праўкай | 1956 | 92 | 1 | |
| 39 | "Глубокое течение". Інсцэніроўка рамана І.П. Шамякіна. Варыянт. Машынапіс з аўтарскай праўкай | 1956 | 91 | 1 | |
| 40 | "Глыбокая плынь". Інсцэніроўка рамана І.П. Шамякіна. Варыянт. Машынапіс | 1956 | 52 | 1 | |
| 41 | "Дети". Інсцэніроўка па матывах апавяданняў М. Горкага (да 100 - годдзя з дня нараджэння). Машынапіс | 1968 | 25 | 1 | |
| 42 | "Мінскі напрамак". Інсцэніроўка паводле аднайменнага рамана І.П. Мележа. Варыянт. Машынапіс | 1975 | 72 | 1 | |
| 43 | "Мінскі напрамак". Інсцэніроўка паводле | 1976 | 206 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | аднайменнага рамана І.П. Мележа. Варыянт. Аўтограф | | | | |
| 44 | "Альпійская балада". Інсцэніроўка аднайменнай аповесці В.У. Быкава. Машынапіс з аўтарскай праўкай | 1979 | 60 | 1 | |
| 45 | "Пойти и не вернуться". Інсцэніроўка паводле аднайменнай аповесці В.У. Быкава. Машынапіс | 1979 | 109 | 1 | |
| 46 | "Блакітнае ззянне". Інсцэніроўка паводле аднайменнага апавядання Р.К. Сабаленкі. Машынапіс | [1970-я гг] | 23 | 1 | |
| 47 | "Вяселле". Інсцэніроўка паводле аднайменнага апавядання А.П. Кудраўца. Аўтограф | [1970-я гг] | 26 | 1 | |
| 48 | "Салют". Інсцэніроўка паводле аднайменнага апавядання М.Ц. Лынькова. Машынапіс | [1970-я гг] | 13 | 1 | |
| 49 | "Романтическая история". Інсцэніроўка паводле аднайменнай аповесці В.Д. Паваляева. Машынапіс | [1980-я гг] | 14 | 1 | |
| | **1.4. АПАВЯДАННІ, АРТЫКУЛЫ І ІНШ.** | | | | |
| 50 | "Сапраўднае каханне". Апавяданне. Варыянты. Аўтарызаваны машынапіс, выразка з газеты | 1959 | 12 | 2 | |
| 51 | "Любімы горад"="Колька", "Один". Апавяданні. Машынапіс, выразка з газеты. Прыкладзена пісьмо дырэктара Белдзяржэстрады ад 10.01.1959 г. у рэпертуарны аддзел Міністэрства культуры БССР аб набыцці ў С.Я. Гурыч яе твора. Л. 1 | 1959-1961 | 32 | 5 | |
| 52 | "Вогненныя сцежкі"="Ніхто не забыты, нішто не забыта". Артыкулы пра В.В. Чамялова - артыста ТЮГ БССР імя Н.К. Крупскай, які загінуў у гады Айчыннай вайны. Варыянты. Машынапіс, выразка з газеты | 1975 | 15 | 2 | |
| 53 | "Артысты беларускіх тэатраў у перадачах літаратурна-драматычнага радыёвяшчання", "Майстэрства ўдзельнічаць вобразамі", "Режиссура литературно-драматических передач" і інш. Артыкулы. Машынапіс з аўтарскай праўкай, машынапіс, выразка з газеты | [1980-я гг] | 48 | 6 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 54 | "Нравственно-эстетические принципы искусства социалистического реализма на современном этапе". Артыкул.<br>Аўтограф | [1970-я гг] | 17 | 1 | |
| 55 | "Слова, музыка, вобраз". Нататкі пра мастацкі вобраз радыёспектакля.<br>Выразка з газеты | 1982 | 1 | 1 | |
| 56 | Выступленне пра працу рэдакцыі літаратурна-драматычнага вяшчання рэспубліканскага радыё.<br>Машынапіс | [1970-я гг] | 8 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 57 | С.Я. Гурыч. "Вяртанне". Радыёп'еса. У перакладзе Э.С. Валасевіча з рускай мовы.<br>Аўтарызаваны машынапіс Э.С. Валасевіча | 1965 | 8 | 1 | |
| | **2. ПІСЬМЫ ДА С.Я. ГУРЫЧ** | | | | |
| 58 | Пісьмы Б.Е. Жукоўскага, І.П. Шамякіна да С.Я. Гурыч.<br>Арыгінал, копія | 1952,1957 | 2 | 2 | |
| 59 | Пісьмы, тэлеграмы Рэспубліканскага дома народнай творчасці г. Мінска (3), Палаца культуры МТЗ (2), рэдакцыі газеты "Советская культура" і інш. С.Я. Гурыч аб супрацоўніцтве | 1947-1979 | 10 | 10 | |
| | **3. ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ С.Я. ГУРЫЧ** | | | | |
| 60 | Дагаворы, працоўнае пагадненне Брэсцкага абласнога драмтэатра імя Ленінскага камсамола БССР, Белдзяржэстрады з С.Я. Гурыч на пастаноўку спектакляў, падрыхтоўку кампазіцыі святочнага канцэрта да 40 - годдзя савецкай улады | 1947-1957 | 3 | 3 | |
| 61 | Запрашальныя білеты на творчую сустрэчу з артыстамі і рэжысёрам радыёспектакля "Хамуціус" паводле паэмы А.А. Куляшова, на прагляд спектакля "Юность отцов" Б. Л. Гарбатава і інш. (рэж. С.Я. Гурыч) | 1950-1985 | 6 | 3 | |
| 62 | Паведамленне ГИТИСа С.Я. Гурыч аб допуску да прыёмных экзаменаў на рэжысёрскі факультэт, пасведчанне аб працы пазаштатным карэспандэнтам газеты "Мінская праўда" | 1951,1966 | 2 | 2 | |
| 63 | Камандзіровачныя пасведчанні Славянскага | 1953,1954 | 2 | 2 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | дзяржаўнага рускага драмтэатра імя У.У. Маякоўскага С.Я. Гурыч на творчыя камандзіроўкі ў Маскву з наведваннем маскоўскіх тэатраў | | | | |
| 64 | Загад дырэктара Славянскага дзяржаўнага рускага драмтэатра імя У.У. Маякоўскага аб аб'яўленні паддзякі С.Я. Гурыч за "произведённую срочную замену артистки в спектакле "Девицы - красавицы" (па п'есе А. Сімукова, рэж. С.Я. Гурыч) | 1953 | 1 | 1 | |
| 65 | Рэпертуарны лісток С.Я.. Гурыч - артысткі Брэсцкага абласнога драмтэатра імя Ленінскага камсамола БССР | [1950-я гг] | 1 | 1 | |
| 66 | Характарыстыка С.Я. Гурыч - рэжысёра Белтэлерадыё для паездкі ў Чэхаславакію | 1969 | 1 | 1 | |
| 67 | Дакументы ўдзелу Белтэлерадыё ў фестывалях радыёп'ес "Лента дружбы - 72", "Лента дружбы - 75", якія праводзіліся на Дзяржтэлерадыё Літоўскай ССР: пісьмы, інфармацыі пра радыёспектаклі і інш. | 1973-1976 | 5 | 4 | |
| 68 | Дакументы С.Я. Гурыч аб вылучэнні на Дзяржаўную прэмію БССР у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры за 1974 г.: спіс кандыдатаў, водгукі слухачоў на радыёспектакль "Векапомныя дні" паводле рамана М.Ц. Лынькова | | 9 | 3 | |
| 69 | Дакументы С.Я. Гурыч аб вылучэнні на Дзяржаўную прэміяю БССР у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры за 1984 г.: спісы кандыдатаў, яе даведка аб радыёспектаклях, водгукі на іх Літаратурнага музея Я. Коласа, радыёслухачоў Мінскага камвольнага камбіната і інш. | | 30 | 12 | |
| 70 | Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР аб прысваенні С.Я. Гурыч звання "Заслужаны работнік культуры Беларусі". Выразка з газеты | 1985 | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 71 | "Информационный список драматических произведений " (у т.л. інфармацыя пра п'есу С.Я. Гурыч "Танежицкие девчата" ). Бюлетэнь №3. Друкаванае выданне | 1963 | 14 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 72 | Афішы спектакляў Брэсцкага абласнога драмтэатра імя Ленінскага камсамола БССР "Сын" | 1947-1948 | 6 | 6 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | С. Паташова, "Сустрэча з юнацтвам" А.М. Арбузава, "Старыя сябры" Л.А. Малюгіна і інш. (рэж. С.Я. Гурыч).<br>На многіх - віншаванні дырэктара тэатра В.Ф. Мірскага | | | | |
| 73 | Праграмы спектакляў Палаца культуры МАЗа "Юность отцов" Б.Л. Гарбатава, "Пайсці і не вярнуцца" В.У. Быкава і інш. (рэж. С.Я. Гурыч) | 1950 | 5 | 3 | |
| 74 | Праграмы спектакляў Славянскага дзяржаўнага рускага драмтэатра імя У.У. Маякоўскага: "Таня" А.М. Арбузава, "Мария Тюдор" В. Гюго, "Опасный спутник" А. Салынскага і інш. (рэж. С.Я. Гурыч).<br>Прыкладзены яе рэпертуарны ліст ад 19.08.1954 г. Л. 20 | 1951-1955 | 22 | 12 | |
| 75 | Афіша, запрашэнне на спектакль Гомельскага абласнога рускага драмтэатра "Глубокое течение" паводле рамана І.П. Шамякіна (рэж. С.Я. Гурыч) | 1957 | 3 | 3 | |
| 76 | Праграма музычнай камедыі "Долина счастья" паводле камедыі К.Л. Губарэвіча, І.Л. Дорскага (рэж. С.Я. Гурыч) і інш.<br>Прыкладзена рэцэнзія Б. Смольскага "Музычная камедыя павінна быць" на спектакль - выразка з газеты. Л. 4 | 1958 | 4 | 3 | |
| | **4. ДАКУМЕНТЫ ПРА С.Я. ГУРЫЧ** | | | | |
| 77 | Верш - прысвячэнне С.Я. Гурыч ад артыстаў Славянскага дзяржаўнага драмтэатра імя У.У. Маякоўскага.<br>З аўтографамі артыстаў | 1952 | 1 | 1 | |
| 78 | Т.А. Абакумоўская. "Тэатр слова".<br>Я. Хвалей. "Узнагароды радыётэатру" і інш.<br>Артыкулы пра С.Я. Гурыч і з упамінаннем пра яе.<br>Выразкі з часопіса і газет | 1977-1988 | 4 | 3 | |
| 79 | Рэцэнзіі, водгукі на спектаклі Славянскага рускага драмтэатра імя У.У. Маякоўскага "Юность отцов" Б.Л. Гарбатава, "Тропою грома" К. Мюфке, "Как закалялась сталь" М.А. Астроўскага і інш. (рэж. С.Я. Гурыч).<br>Выразкі з газет | 1951-1954 | 8 | 8 | |
| 80 | Рэцэнзіі на спектаклі Гомельскага абласнога драмтэатра "Іван Рыбакоў" В.М. Гусева , "Гісторыя аднаго кахання" К.М. Сіманава, "Маці сваіх дзяцей" А.М. Афінагенава і і нш. (рэж. С.Я. Гурыч).<br>Выразкі з газет | 1955-1956 | 6 | 6 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 81 | Рэцэнзіі Т.А. Абакумоўскай, А. Мацкевіча, Ю. Іваноўскага і інш. на радыёспектакль "Векапомныя дні" паводле рамана М.Ц. Лынькова.<br>Выразкі з газет | 1974 | 7 | 7 | |
| 82 | Рэцэнзіі Т.А. Абакумоўскай, А. Бараноўскага, З.І. Браварскай і інш. на радыёспектакль "Новая зямля" паводле паэмы Я. Коласа.<br>Выразкі з газет | 1976 | 4 | 4 | |
| 83 | Т.А. Абакумоўская. "Апошні бой, ён цяжкі самы..."<br>А. Бараноўскі. "Мінскі напрамак" на радыёсцэне".<br>Р. Лапотка. "Вечна хвалюючая тэма" і інш.<br>Рэцэнзіі на радыёспектакль "Мінскі напрамак" паводле рамана І.П. Мележа.<br>Выразкі з газет | 1976-1986 | 6 | 6 | |
| 84 | Рэцэнзіі Т.А. Абакумоўскай, У.І. Няфёда, І. Кузняцовай і інш. на радыёспектаклі "Пайсці і не вярнуцца", "Альпійская балада" паводле аповесцей В.У. Быкава, "Вазьму твой боль" паводле рамана І.П. Шамякіна.<br>Аўтограф, машынапіс, выразкі з газет | 1979-1980 | 6 | 6 | |
| 85 | Т.А. Абакумоўская. "Поступ паэзіі".<br>Л. Байдакоў. "Ад шчырага сэрца".<br>Р. Лапотка. "Тэатр слова"  і інш. Рэцэнзіі на радыёспектаклі "Хамуціус", "Рыбакова хата" паводле паэм А.А. Куляшова , Я. Коласа, рамана В.Ф. Карамазава "Пушча".<br>Выразкі з газет, друкаванага выдання | 1984 | 12 | 8 | |
| | * * * | | | | |
| 86 | Пісьмы радыёслухачоў на Белтэлерадыё з водгукамі на радыёспектаклі "Новая зямля" паводле паэмы Я. Коласа (рэж. С.Я. Гурыч) | 1976 | 9 | 7 | |
| 87 | Пісьмы радыёслухачоў на Белтэлерадыё з водгукамі на радыёспектакль "Мінскі напрамак" паводле рамана І.П. Мележа (рэж. С.Я. Гурыч) | 1976-1985 | 38 | 27 | |
| 88 | Пісьмы радыёслухачоў на Белтэлерадыё з водгукамі на радыёспектакль "Завеі, снежань" паводле рамана І.П. Мележа (рэж. С.Я. Гурыч) | 1979 | 6 | 5 | |
| 89 | Пісьмы радыёслухачоў на Белтэлерадыё з водгукамі на радыёспектаклі "Возьму твою боль" паводле рамана І.П. Шамякіна, "Галуба" па матывах аповесці В.Ф. Карамазава і інш. | 1979-[1980-я гг] | 11 | 7 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 90 | Пісьмы радыёслухачоў на Белтэлерадыё з водгукамі на радыёспектакль "Пайсці і не вярнуцца" паводле аповесці В.У. Быкава (рэж. С.Я. Гурыч) | 1979-1984 | 13 | 10 | |
| 91 | Пісьмы радыёслухачоў на Белтэлерадыё з водгукамі на радыёспектакль "Хамуціус" паводле паэмы А.А. Куляшова (рэж. С.Я. Гурыч) | 1981-1982 | 7 | 6 | |
| 92 | Пісьмы радыёслухачоў на Белтэлерадыё з водгугамі на радыёспектаклі "Пушча" паводле рамана В.Ф. Карамазава, "Хатынскі снег" паводле паэмы Г.М. Бураўкіна (рэж. С.Я. Гурыч) | 1984-1985 | 10 | 6 | |
| | **5. ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ** | | | | |
| 93 | Фатаграфіі С.Я. Гурыч, індывідуальныя. Арыгінал, копіі | [1940-я-1980-я гг] | 3 | 3 | |
| 94 | Фатаграфія С.Я. Гурыч з сынам М.Л. Івановым | [1948] | 1 | 1 | |
| 95 | Фатаграфіі С.Я. Гурыч з сябрамі і знаёмымі. Копіі | [1940-я гг] | 2 | 2 | |
| 96 | Фатаграфіі С.Я. Гурыч у групе з Г.А. Арловай, М.Г. Захарэвіч, З.П. Зубковай і інш. лаўрэатамі Дзяржаўнай прэміі БССР у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры | 1984 | 2 | 2 | |
| 97 | Фатаграфія С.Я. Гурыч каля магілы В.В. Чамялова - былога акцёра ТЮГ БССР імя Н.К. Крупскай. Венгрыя | [1980-я гг] | 1 | 1 | |
| 98 | Фатаграфіі С.Я. Гурыч з Ю.У. Сідаравым, Г.К. Макаравай, З.Ф. Стомам і інш. у час працы над радыёперадачамі на Белтэлерадыё | [1980-я гг] | 6 | 6 | |

У дадзены вопіс унесена 98 (дзевяноста восем)

спраў з № 1 па № 98 , 289 дакументаў.

Вопіс склала і апрацоўку
фонда зрабіла

_______________________

Дакументы прынялі:

_______________________

_______________________

"_____"____________20____ г.